# МІХАСЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ ТЫЧЫНА



10 лютага споўнілася 60 гадоў вядомаму крытыку і літаратуразнаўцу, пісьменніку і педагогу, лаўрэату Літаратурнай прэміі імя У. Калесніка Саюза беларускіх пісьменнікаў, доктару філалагічных навук, прафесару Міхасю Аляксандравічу Тычыну.

М.А. Тычына нарадзіўся ў сям'і золаташукальніка ў пасёлку Ленінскі Алданскага раёна (Якуція), куды сем'і яго будучых бацькоў былі высланы як кулакі. З 1947 г. разам з бацькамі жыў у вёсцы Завалочыцы Глускага раёна Магілёўскай вобласці. У 1959–1964 гг. вучыўся на філалагічным факультэце Брэсцкага педагагічнага інстытута. Служыў у Савецкай Арміі, працаваў настаўнікам у Пінскім раёне. На працягу 1967–1970 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры АН БССР. Пасля яе заканчэння там жа працаваў малодшым, з 1976 г. – старшым навуковым супрацоўнікам, а з 1999 г. узначальвае аддзел тэорыі літаратуры. Адначасова з 1993 г. – выкладчык Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, з 2000 г. – дацэнт, з 2003 г. – прафесар кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя БДУ.

Багаты і надзвычай шматгранны навуковы і творчы вопыт М.А. Тычыны. Спачатку ў перыядычных выданнях 1963–1967 гг. з'явіліся яго вершы, потым былі апавяданні, аповесці, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Ён выдаў кнігі прозы "Дажынкі" (1979) і "Вяртанне: Аповесць пра Кузьму Чорнага" (1984).

Як літаратуразнаўца і крытык М.А. Тычына добра вядомы за межамі Беларусі. Кола яго навуковых і літаратурных інтарэсаў вельмі шырокае і закранае самыя розныя праблемы развіцця беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. Ён – аўтар звыш 300 друкаваных прац, якія вызначаюцца аналітызмам, грунтоўнасцю і канцэптуальнасцю. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Мастацкае мысленне Кузьмы Чорнага-раманіста як творчы працэс (40-я гады)", неўзабаве выдаў кнігу "Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення" (1973). Праблемы нацыянальнага характару і гістарызму прааналізаваў у раздзелах калектыўных даследаванняў "Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне" (1980) і "Магчымасці рэалізму" (1982). У кнігах літаратурна-крытычных артыкулаў "Змена квадры" (1983) і "Час прозы" (1988) ахарактарызаваў стан і перспектывы развіцця сучаснай беларускай прозы. На тыпалагічных асаблівасцях эстэтычнага асэнсавання вайны ў беларускай літаратуры і літаратурах іншых народаў свету засяродзіў увагу ў кнізе "Народ і вайна" (1985). Сувязь творчасці І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Адамовіча, У. Караткевіча, В. Адамчыка, В. Казько і іншых пісьменнікаў з фальклорам разгледзеў у кнізе "Карані і крона" (1991, другое выданне ў 2002).

М.А. Тычына – адзін з аўтараў "Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей" у чатырох тамах (1994. Т. 2, 3) і "Нарысаў беларуска-украінскіх літаратурных сувязей" (2002), кнігі "Аляксандр Пушкін і Якуб Колас" (1999). У 2001 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Якуб Колас і руская літаратура першай паловы XIX ст."

Прызнаннем аўтарытэту М.А. Тычыны ў творчым і навуковым асяроддзі з'явілася выданне яго зборніка прозы "Дажынкі" ў 1981 г. на рускай мове ў Маскве, публікацыя многіх крытычных і літаратуразнаўчых артыкулаў за межамі Беларусі. Ён пераклаў на беларускую мову кнігу А. Адамовіча "Апакаліпсіс па графіку" (1992), прымаў удзел у выданні Збору твораў у 8 тамах К. Чорнага (1972–1975); Збору твораў у 10 тамах І. Мележа (1979–1985); напісаў прадмовы да Выбраных твораў у 2 тамах В. Адамчыка (1983); Збору твораў у 6 тамах В. Быкава (1991), да кніг К. Чорнага, А. Адамовіча, В. Тараса, М. Булгакава, І. Ралько, А. Кабаковіч, Г. Лангфела і У. Уітмена, раздзелы ў падручніках беларускай літаратуры для 9-х і 11-х класаў сярэдніх школ.

І сёння М.А. Тычына натхнёна працуе, пра што сведчаць яго змястоўныя раздзелы пра Я. Коласа, беларускую прозу 1920–1930-х гг., К. Чорнага, В. Быкава, А. Адамовіча ў акадэмічнай "Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя" ў 4 тамах (1999–2003). Віншуем Міхася Аляксандравіча з юбілеем, шчыра жадаем яму моцнага здароўя, вялікага шчасця, плёну на ніве філалогіі і прыгожага пісьменства.

***А.Л. Верабей,***
кафедра беларускай літаратуры XX стагоддзя